**Н. Г. ГРЭКАВА—**

**Сакратар ЦК КП(б) Беларусі, Старшыня Вярхоўнага Совета БССР**

# Міжнародны Комуністычны Жаночы Дзень

Міжнародны Комуністычны жаночы дзень—8 сакавіка—шчаслівыя жанчыны краіны Советаў, разам з усім совецкім народам сустракаюць у абстаноўцы грандыёзных перамог соцыялізма.

За годы двух Сталінскіх пяцігодак наша краіна дасягнула нябачанага росквіту. Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, пад кіраўніцтвам правадыра народаў таварыша Сталіна ажыццяўлены грандыёзныя задачы. У нашай краіне ў асноўным пабудавана соцыялістычнае грамадства. Сталінская Канстытуцыя замацавала сусветна гістарычны факт: СССР уступіў у новую паласу развіцця, у паласу заканчэння будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да комунізма.



Н. Г. Грэкава

Святкаванне 8 сакавіка пройдзе ў гэтым годзе пад знакам асабліва высокага ўздыму палітычнай і творчай актыўнасці народаў СССР.

Рашэнне пленума ЦК ВКП(б) аб скліканні чарговага XVIII з'езда партыі, апублікаваныя тэзісы даклада тав. В. М. Молатава аб велічным плане трэцяй Сталінскай пяцігодкі і тэзісы даклада тав. Жданава аб змяненнях у статуце ВКП(б), адобраныя ў асноўным Палітбюро ЦК ВКП(б), ускалыхнулі ўвесь совецкі народ, выклікалі нябачны ўздым сярод усіх слаёў насельніцтва нашай соцыялістычнай радзімы.

Яркім прыкладам гэтага з'яўляецца шырока разгарнуўшаеся соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XVIII з'езда партыі. На фабрыках і заводах, у калгасах і соўгасах, у совецкіх установах расце і шырыцца імкненне працоўных палепшыць сваю работу, адзначыць з'езд новымі вытворчымі перамогамі, падарункамі мацеры-радзіме.

Гэты палітычны і вытворчы ўздым мас з'яўляецца яркай ілюстрацыяй любві і адданасці совецкага народа да сваёй большэвіцкай партыі, да свайго правадыра і настаўніка Вялікага Сталіна.

Наша совецкая жанчына знаходзіцца ў перадавых радах новага магутнага ўздыму соцыялістычнага спаборніцтва за дастойную сустрэчу гістарычнага з'езда сваёй роднай Комуністычнай партыі новымі вытворчымі перамогамі, новымі подвігамі, за далейшае ўмацаванне магутнасці Совецкага Саюза і яго абароназдольнасці.

Невычарпальныя крыніцы энтузіязма і майстэрства праяўляюць працоўныя жанчыны соцыялістычнай Беларусі, паказваючы ўзоры выдатнай работы. Так, лепшая стаханаўка запалкавай фабрыкі імя Кірава (горад Барысаў) т. Калічонак, дае рэкордную выпрацоўку—72 тысячы каробак за змену, што складае 169 проц. да плана. Жаночая брыгада шакаладнага цэха Менскай кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка» (брыгадзір тав. Эпштэйн) выконвае норму на 200 процантаў. Узятыя абавязацельствы калектывам фабрыкі, даць краіне прадукцыі на 900 тысяч рублёў звыш плана к адкрыццю з'езда гістарычных перамог комуністычнай партыі, к 10 сакавіку 1939 года, выконваюцца з гонарам.

Стаханаўка Менскай фабрыкі імя Кагановіча тав. Бялевіч — узнагароджаная граматай Вярхоўнага Совета БССР, выконвае норму на 316 процантаў. Звыш чатырох норм за адну змену дае стаханаўка Лехевіч на працэсе намазкі падэшваў. Тав. Рынян (скурзавод «Большэвік») дае 225 процантаў нормы на працэсе вырывання шчаціны, тт. Сушкова і Горэвая—220 проц.

Брыгада калгасніцы Ганны Буй на Старадарожскім лесапункце ў складзе 4-х чалавек 6 лютага выканала норму лесазагатовак на 186 проц., 8-га лютага—на 306 проц., 19 лютага—на 418 процантаў. Брыгада Ганны Буй абавязалася даць к XVIII з'езду ВКП(б) 500 проц. плана.

Беларускі народ ганарыцца сваімі лепшымі дочкамі, узнагароджанымі Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР за выдатныя поспехі ў сельскай гаспадарцы. 58 лепшых жанчын узнагароджаны ордэнамі Саюза. Сярод іх гераіня соцыялістычнай працы Кондзерова Анна Ільінічна—звенявая калгаса «Юны Комунар», Чаускага раёна, даўшая рэкордны ўраджай ільнавалакна 14 цэнтнераў з гектара і ільнонасення 8,6 цэнтнера, атрымала вышэйшую ўзнагароду—ордэн Леніна

Гэта высокая ўзнагарода абавязвае ўсіх жанчын Беларускай ССР з яшчэ большым энтузіязмам і энергіяй змагацца за далейшыя перамогі соцыялізма.

Жанчыны краіны советаў выказваюць сваю бязмежную любоў да партыі большэвікоў, якая стварыла шчасце і радасную працу, якая ўзняла з-пад спуду такую велізарную сілу жанчын і пусціла ў справу, хто асвяціў сонечнымі праменнямі

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

шчасця, сагрэў бацькоўскімі клопатамі, выхаваў адданасць да сваёй радзімы, хто стварыў бессмяротнае тварэнне—Сталінскую Канстытуцыю—свайму роднаму Сталіну. У славу імені Сталіна жанчыны неабдымнай нашай радзімы гатовы на любыя подвігі.

Увесь свет ведае гераінь-лётчыц тт. Грызадубаву, Осіпенка, Раскову, якія пабілі сусветны рэкорд на дальнасць пералёту. Хто не ведае ініцыятараў стаханаўскага руху, гераінь сацыялістычнай працы Еўдакію і Марыю Вінаградавых, Марыю Дземчэнка, Пашу Ангеліну, Пашу Ковардак, наватараў сацыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі Беларускай ССР Зосю Рачок, Міклашэўскую, Журанкову, Шульц, Бутнікаву, Храмую і многіх другіх.

пагражаючы ахапіць ёй увесь свет. Фашысцкія захопнікі, імперыялістычныя драпежнікі ўжо трэці год як вядуць вайну ў Іспаніі, імкнучыся ператварыць іспанскую рэспубліку ў сваю калонію, а на гераічны свабодалюбівы народ надзець ярмо рабства. Ужо паўтары гады фашысцкая Японія вядзе драпежніцкую вайну ў Кітаі. Фашысцкая Германія захапіла Аўстрыю, вялікую частку Чэхаславакіі. Фашысцкая Германія і Італія пры поўнай падтрымцы буйнай буржуазіі ажыццяўляюць свае драпежніцкія планы захопа чужых зямель, падпарадкоўваюць сабе малыя і слабыя безабаронныя народы, рыхтуюць новую імперыялістычную бойню. Яны точуць зубы супроць адзінай у свеце краіны сацыялізма—СССР.

Але расце арганізаванасць і згуртаванасць ра-

С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке